УДК 821.161.3.09

*А.М. Макарэвіч* (Магілёў, Беларусь)

# ЭСТЭТЫЧНЫ ЗМЕСТ І ВЫХАВАЎЧАЕ ЗНАЧЭННЕ АПОВЕСЦІ ІВАНА НАВУМЕНКІ "ВАЙНА КАЛЯ ЦІТАВАЙ КОПАНКІ"

Прапаноўваецца прачытанне аповесці Івана Навуменкі "Вайна каля Цітавай копанкі" з пазіцыі гістарычнай рухомасці мастацкага твора. На падставе характарыстыкі цэнтральных літаратурных герояў, праблематыкі выяўляецца эстэтычны патэнцыял і выхаваўчае значэнне аповесці.

Ivan Naumenko's narrative "War by Titov Pond" is read from a position of historical mobility of a fiction. An aesthetic potential and an educational value of the narrative are revealed through description of its main characters, its subject matter and problem moral and artistic situations.

Літаратурная спадчына Івана Навуменкі – гэта не толькі творы для дарослага чытача, а і для дзіцячага ўспрымання: апавяданні "Мішаў калейдаскоп" (1954), "Настаўнік чарчэння" (1956), "Жуль Верн" (1959), "Як мы лавілі шпіёна" (1964), "Звіні, званок" (1965), "Па грыбы" (1965), "Мяшок белага наліву" (1970), аповесць "Вайна каля Цітавай копанкі" (1957) і інш. Некаторыя з твораў пісьменніка для дзіцячага чытання вывучаюцца ва ўстановах сярэдняй адукацыі (шосты клас: аповесць "Вайна каля Цітавай копанкі" – твор, рэкамендаваны для дадатковага чытання; сёмы клас: апавяданні "Жуль Верн" (для чытання і вывучэння), "Настаўнік чарчэння" (для чытання і абмеркавання) [1, с. 34, 41]). Відаць, нездарма складальнікі вучэбнай праграмы па беларускай літаратуры для агульнаадукацыйных устаноў звярнулі ўвагу на творы І. Навуменкі з кола дзіцячага чытання: яны маюць выхаваўча-пазнавальны патэнцыял, які дастаткова ўдала можа быць выкарыстаны ў працэсе выхавання сучасных дзяцей.

Такую асаблівасць гэтай часткі літаратурнай спадчыны пісьменніка вызначыла Л. Кароткая ў пачатку 1980-х гг. у прадмове да першага тома шасцітомнага збору твораў І. Навуменкі.

*"Выдатна ўмее пісаць празаік аб дзецях і для дзяцей. Яго аповесць "Вайна каля Цітавай копанкі" вылучаецца разуменнем дзіцячай псіхалогіі, уменнем драматызаваць штодзённасць, без дакучлівай павучальнасці ставіць і вырашаць сур'ёзныя пытанні маралі і паводзін. Можна нагадаць яшчэ апавяданні "Жуль Верн" і "Пераломны ўзрост". У іх пісьменнік вельмі свабодна адчувае сябе ў дзіцячай сферы, дасціпна і з жыццёвай перaканаўчасцю паказвае справы і клопаты дзяцей, іх зносіны з дарослым светам"* [2, с. 11].

У беларускай літаратуры XX ст. назіраецца выразная тэндэнцыя стварэння вобразаў грамадскіх лідараў рознага ўзроўню і, адпаведна, паказу залеж-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

насці шараговага чалавека ад волі, прынцыпаў, памкненняў гэтых лідараў (аповесці "Дзве душы" М. Гарэцкага, "Ні госць ні гаспадар" Л. Калюгі, "Межы", "Новая дарога" С. Баранавых, раманы "Запіскі Самсона Самасуя" А. Мрыя, "Сцежкі-дарожкі" М. Зарэцкага, "Глыбокая плынь", "Крыніцы" І. Шамякіна, цыкл раманаў "Палеская хроніка" І. Мележа і інш.). Не з'яўляецца выключэннем у гэтых адносінах і дзіцячая літаратура, якая ў савецкі час таксама была своеасаблівым адбіткам, ілюстрацыяй тых ідэйна-творчых, маральных тэндэнцый, што існавалі ў тагачасным грамадстве (аповесці "ТВТ" Я. Маўра, "Базылёў курган" А. Якімовіча, "Жоўтая акацыя" У. Дубоўкі, "Лісце каштанаў" У. Караткевіча, "Як на нашы імяніны", "Навасёлы..." П. Місько і інш.).

Пацвярджэннем прыведзенай вышэй выснове можа быць таксама і аповесць І. Навуменкі "Вайна каля Цітавай копанкі" – твор, праблематыка (прынамсі, праблема лідарства ў дзіцячым калектыве, сапраўднага і ў адпаведнасці з прымусам сяброўства і інш.), маральны, эстэтычны, пазнавальны змест якога застаюцца надзённымі і ў наш час. Акрамя гэтага, аповесць утрымлівае ў сабе патэнцыял актуалізацыі яе пазнавальнага значэння ў наступнай плоскасці: захапленні дзяцей канца дваццатых – трыццатых гадоў[1], маральны аспект гэтых захапленняў, параўнальнае рэцэпцыйнае ўспрыманне інтарэсаў тагачасных і сучасных дзяцей.

Падзеі твора адбываюцца ў пераважнай большасці выпадкаў на летніх канікулах, калі намеры малодшых школьнікаў, не абцяжараных вучобай, могуць здзяйсняцца без асаблівых перашкод. Сістэма вобразаў аповесці складаецца з некалькіх груп літаратурных герояў: дзятва са Слабодкі і Першамайкі ў іх супрацьстаянні, дарослыя з пэўнай іх мэтай у адносінах да захапленняў і намераў дзяцей: натхняючай (настаўніца малодшых класаў Марыя Рыгораўна, "дурнаваты" Пепа і інш.), арганізуючай (дзядзька Косці Кветкі, стары Лявон – начны вартаўнік коней), разбуральнай (стары Тарабан, Яшаў бацька).

У аповесці паступова разгортваецца супрацьстаянне двух гуртоў малодшых школьнікаў: хлопчыкаў са Слабодкі і Першамайкі. Правадыры гэтых гуртоў – Алёша Тарабан і Косця Кветка. Звернем увагу на тое, што прозвішчы гэтых герояў гаваркія; паказальныя рысы іх знешнасці: першы – з рудымі валасамі, другі – светлавалосы; аўтар іх часта так і называе: руды Алёша і светлавалосы Косця. Асноўная відавочная і вонкавая прычына вызначанага вышэй супрацьстаяння – жаданне кожнага з гуртоў быць гаспадарамі на Цітавай копанцы, не пускаючы да яе праціўнікаў.

"*Да таго, як пачалася гэтая вайна, Слабодка з Першамайкай проста гулялі паміж сабой у чырвоных і белых, а таксама ў Чапаева і бацьку Махно*" [3, с. 18].

---

[1] Час, у які разгортваюцца падзеі твора, непасрэдна ў аповесці не вызначаны. Мяркуючы па заўвагах герояў у адносінах да рэальных падзей, па аўтарскіх ацэнках рэтраспекцыйных фактаў (арганізацыя калгаса, камсамольскага і піянерскага руху, антырэлігійны велікодны дэмарш камсамольцаў каля царквы, гульні дзяцей у "*Чапаева і бацьку Махно*"), мастацкі час твора можна суаднасіць з канцом 1920-х – пачаткам 1930-х гадоў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Сапраўдная ж прычына непрымірымых адносін слабадскіх і першамайскіх хлапчукоў больш глыбокая. Яна ў наступным: імкненне Алёшы і Косці да лідарства і жаданне захаваць яго, выкарыстоўваючы розныя нагоды і формы змагання. Болей за тое, "*фанабэрысты і жорсткі*" Алёша быў, відаць, апантаны ў другое "ваеннае" лета жаданнем адпомсціць Косцю за яго перавагу над ім у школьнай справе. "*Ён, мабыць, не мог даравацъ Косцю школьнай славы і п'есы*" [3, с. 38], пастаўленай вучнямі ў час зімовых канікул пасля першага "ваеннага" лета. У гэтай пастаноўцы правадыр першамайцаў бліскуча выканаў ролю белагвардзейскага генерала. У Алёшавых ваяўнічых планах назіраем імкненне нікчэмнасці адпомсціць за сваю нікчэмнасць, хаваючы яе за вонкавай перамогай.

Падзеі твора разгортваюцца ў кантэксце ўзаемаадносін Яшы Яскаўца і Косці Кветкі з сябрамі, ворагамі, дарослымі. У пачатку аповесці Яша – ахвяра ваяўнічых настрояў камандзіра слабадчанцаў Алёшы Тарабана, у фінале – пераможца над сваім крыўдзіцелем; Косця – не надта ўдалы ў адносінах да "вайсковай" стратэгіі камандзір першамайцаў, а потым – лідар, упэўнены ва ўласных сілах і моцы згуртаванага адзінай ідэяй калектыву.

На чале слабадчанцаў і першамайцаў стаяць камандзіры-антыподы.

**Алёша Тарабан**. У першае "ваеннае" лета скончыў трэці клас. Да яго "*падлізваюцца ўсе хлопцы*" са Слабодкі, бо "*яго ўсе баяцца*"; ён "*самы дужы*" ў сваёй кампаніі. "*Сіла Рудога Алёшы яшчэ болей ўзрасла з таго часу, як яго бацька пакінуў калгас і стаў загадваць самай вялікай крамай на сяле*" [3, с. 7, 10]. Ён адзін з шасцярых дзяцей у Тарабанаў, якія былі "*рудыя, крыклівыя і ніколі нічога нг саромеліся*", "*паміж сабой не ладзілі*", але "*гэта не шкодзіла ім дружна і з'яднана нападаць на чужых*" [3, с. 7-8]. Стваральныя Алёшавы намеры (канструяванне ўласнага трактара, для якога хлопцы кралі на станцыі дэталі ад малатарань) не мелі поспеху, а вось разбуральныя (крадзеж яблык, змаганне за Цітаву копанку і інш.) рэалізоўваліся паспяхова. Для правядзення "*сапраўднай вайны*" з першамайцамі Алёша захаваў за сабой "*пост галоўнага камандуючага*", камандзірамі ж палкоў прызначыў Змітрака Калашкана і Алеся Бахілку. У другое "ваеннае" лета "*з'явіліся начальнікі кавалерыі, артылерыі, авіяцыі*". Тарабан "*выдумаў такія пасады*" не толькі дзеля таго, каб асучасніць "*сваю армію*", а і таму, што, "*мабыць, хацеў, каб яго акружаў вялікі штаб*" [3, с. 36]. Сярод такіх начальнікаў быў і "*дужы як бык*" Цярэшка Лузанік; гэты "*начальнік артылерыі*" "*за шэсць год сваёй вучобы не здолеў нават закончыць трох класаў*" [3, с. 36], але ж як камандзір "*паставіў сябе дужа высока*" ў адносінах да Яшы, які ў другое "ваеннае" лета таксама быў прызначаны Тарабанам хоць і невялікім, але начальнікам: "*старшым бамбардзірам*". Гэты ж самы камандзір – Лузанік – не ў стане засвоіць прыдуманую "*галоўным камандуючым*" "*новую мову*" дзеля захавання "*ваеннай тайны ад варожай разведкі*". У той жа час яго падначалены – Яша – цудоўна спраўляецца з такой задачай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пісьменнік звяртае ўвагу не толькі на працэс перанясення сацыяльнага раздзялення на галоўных і другарадных са сферы дарослых адносін у дзіцячыя, а і на фарміраванне культу асобы ў дзіцячым асяроддзі. Напрыклад, пасля "*налёту на Салвэсеў сад*" "*Алёша дазволіў з'есці тры яблыкі камандзірам і па два – радавым байцам*" [3, с. 24]. Пасля неаднаразовай перамогі Слабодкі над Першамайкай у першае "ваеннае" лета правадыр слабодскіх хлопчыкаў "*так высока задраў свой аблузаны нос, што з ім проста нельга было размаўляць <...>, не слухаў цяпер нават камандзіраў палкоў <...>. Тарабана лаялі за вочы, але пры ім маўчалі*" [3, с. 27]. Яшава выказванне пра абарону права ўсіх хлапчукоў на адваяваны ў першамайцаў мяч тут жа аказалася перададзеным Тарабану, які "*вечарам збіў пры ўсіх*" [3, с. 28] патэнцыйнага бунтара. Асабліва Тарабанава жорсткасць і зняважлівасць да падначаленых узмацняецца ў другое "ваеннае" лета, калі справа ішла ўжо да канчатковай перамогі над першамайцамі за валоданне Цітавай копанкай. Перамога ў выніку аказалася невясёлай. Асабліва пасля таго, як Тарабан "*злупцаваў без літасці*" свайго "*камандзіра палка*" Зміτрака Калашкана за тое, што той адмовіўся выканаць Алёшаў загад: расстраляць у спіну з рагаткі адпушчаную "з палону" Лізу. Зыход Змітрака з Тарабанавага войска ("*Ваюй цяпер адзін*" [3, с. 46].) стаў пачаткам развальвання гэтага самага войска, якое апошнім часам трымалася толькі на тым, што "*ўсе маўчалі, таму што баяліся рудога Алёшы*" [3, с. 46]. Месца сумленнага камандзіра Змітрака Калашакана ў слабадскім войску заняў недалёкі ў разумовых адносінах Цярэшка Лузанік. Галоўны ж камандзір усё больш захапляўся ўладай над сваім войскам: "*рабіў што хацеў і ніколі ні з кім не лічыўся*", "*зняважаў усіх, хто сам ішоў за ім*" [3, с. 47]; "*сам ішоў*" паводле свайго страху. Пісьменнік неаднаразова звяртае ўвагу на прычыну сляпога падпарадкавання ў Тарабанавым войску: страх.

**Яша Яскавец**. Ён – адзін з тых, хто быў ахвярай Алёшы Тарабана. Яша – старанны вучань (у пачатку аповесці скончыў першы клас). Яго "*Алёша часта крыўдзіў*", але ён "*усё роўна штодня ішоў да Тарабанаў <...> і нават не ўяўляў сабе, што калі-небудзь парвецца гэтая яго няроўная дружба з рудым Алёшам*" [3, с. 8, 10]. Яша здольны ў матэматыцы, захапляецца чытаннем, адданы сяброўству, мае цягу да пазнання навакольнага свету. Ахвяра моцнага і нізкага ў маральных адносінах лідара аказваецца вышэй за яго ў маральнай і інтэлектуальнай сферы. Тут дарэчы прыгадаць прыведзенае вышэй параўнанне: Лузанік – тупаваты камандзір артылерыі – ніяк не мог засвоіць "*новую мову*" Тарабанавага войска; Яша ж – звычайны "ваяр" – вельмі хутка апанаваў новую форму моўных зносін.

**Пепа**. Гэты немалады глухаваты пастух расчыняе для Яшы "*новы і цікавы свет*" даверлівых чалавечых стасункаў, свет прыроды і лічбаў, матэматычных падлікаў. Пепа – "*чалавек з чыстай і адкрытай душой*", якога, аднак, усе "*лічылі блазнам*"; з яго насміхаліся ўсе і з задавальненнем здзекаваўся Руды Алёша. У мінулым Пепа "*вучыўся за доктара*", яго псіхічны стан пахіснуўся пасля таго,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

як "*белыя замучылі на яго вачах маці і сястру*" [3, с. 69] за тое, што Пепа дапамагаў "нашым". Пепа паспрыяў узыходжанню Яшы на шлях, які прывёў хлопчыка да вызвалення ад падпарадкавання разбэшчанаму "ўладай" "*галоўнаму камандуючаму*" слабадской дзетвары. Шлях гэты пачынаўся на прыродным прасторы, дзе Пепа з Яшам пасвілі кароў, а працягваўся ўжо ў сферы зносін з Косцем і яго сябрамі, у назіраннях за жыццём Косцевай камуны, у жаданні далучыцца да стваральных намаганняў і спраў камунараў. Заканчваецца гэты шлях аб'яднаным пратэстам супраць нізрынутага Калацкана.

Дзятва са Слабодкі ўрэшце рэшт далучаецца да Косцевага гурту і яднаецца з камунарамі, якіх згуртаваў правадыр з такім прыгожым і сімвалічным прозвішчам: Кветка.

**Косця Кветка**. У першае "ваеннае" лета ён перайшоў у трэці клас. Як правадыр "*прывабіў усіх першамайскіх хлопцаў*" цікавымі і – галоўнае – незвычайнымі калектыўнымі справамі: гульнёй у валейбол, вырабам самакатаў і планёраў, сумеснай дзейнасцю ў камуне. У гэтай камуне ўсё агульнае і даступнае для ўсіх не на словах, а на самай справе (у Тарабанавым жа войску было ўсё інакш: напрыклад, канфіскаваны ў першамайцаў мяч быў агульным – для усіх – толькі паводле абяцанняў Алёшы, а на самай справе ім карысталіся найперш малыя Тарабаны). Косця, паводле вызначэння Аркадзя Панядзелка (былога "*камандзіра палка*" ў Тарабана, які здрадзіў прысязе і планаваў далучыць сваю дружыну да першамайцаў), "*у сто разоў разумнейшы за Тарабана*" [3, с. 40]. Гэты падлетак-правадыр меў выключна адкрытую душу.

Пры дапамозе фактаў, якія, здавалася б, не маюць ніякіх дачыненняў да гісторыі змагання хлапчукоў са Слабодкі і Першамайкі, пісьменнік праводзіць вельмі істотную і шматсэнсоўную апасродкаваную паралель паміж вытокамі варожасці Тарабана да акаляючага свету і прыхільнымі адносінамі да гэтага свету з боку Кветкі. Параўнаем наступныя факты, пададзеныя ў пачатку (першая частка) і фінале (чатырнаццатая – апошняя – частка) твора.

Алёшаў бацька "*быў заўсёды злосны, насуплены, на людзей пазіраў спадылба і, здаецца, ніколі не смяяўся*" [3, с. 9]. "*Дзверы* [Косцевай. – А.М.] *хаты гасцінна расчыняліся перад кожным, хто б пажадаў сюды зайсці. <...> Ніхто на* [Косцевых сяброў у яго хаце. – А.М.] *не крычаў, і ніхто не ўмешваўся ў іх справы. <...> Нездарма пазней, калі арганізавалася камуна, Косцева хата стала штабам*" [3, с. 64].

Правядзем яшчэ адно параўнанне, прыгадаўшы адзначаны вышэй факт несправядлівага падзелу Алёшам яблыкаў паміж яго "вайскоўцамі": камандзірам па тры, а іх падначаленым па два яблыкі. У Косцевай жа хаце, "*калі на стале ляжаў бохан хлеба, то* [хлопцы. – А.М.] *адломлівалі па ёмістаму кавалку і елі нібы свой*" [3, с. 64].

Нягледзячы на цікавыя і захапляльныя справы ў Косцевай камуне, настрой у першамайцаў асабліва ў другое "ваеннае" лета быў упадніцкі. Бо як жа? Яны прайгралі бітву за Цітаву копанку. "*Хаця Першамайка ж зусім не збіралася, выйграўшы бітву, карыстацца Цітавай копанкай адна. Косця хацеў толькі*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*роўнага права для сябе і сваёй вуліцы, каб купацца, калі захочацца*" [3, с. 51]. Пасля прыведзенай вышэй высновы з адзінаццатай часткі аповесці прапаноўваюцца непасрэдныя аўтарскія характарыстыкі Косці як лідара першамайцаў, які здольны сумнявацца, маральна пакутаваць, шукаць выйсце са складанага становішча і інш. Некаторыя з характарыстык гэтай часткі аповесці, зробленыя ў адносінах да Косці, яго душэўнага стану і памкненняў, маюць форму няўласна-простай мовы: яны належаць нібыта Косцю, у той жа час і аўтару, яны могуць быць сцверджаннямі і чытача, які стаў дастаткова дасведчаным, "дайшоўшы" да гэтай – адзінаццатай – часткі твора. Косця ў сваіх развагах адносна вынікаў "ваенных няўдач", здаецца, падыходзіць да крайняй мяжы дзіцячага расчаравання ва ўласнай значнасці як кіраўніка яго "войска": "*Яму болей не вераць як камандзіру, не вераць, што Першамайка калі-небудзь даб'ецца перамогі над Тарабанам. Ад гэтага хацелася плакаць. <...> Косця адчуў, што ён у бязвыхадным становішчы. Ён зайшоў у нейкі недарэчны тупік і не ведаў, як з яго выбрацца. <...> Камандзір без арміі*" [3, с. 51, 52].

Дапамога ў такім для Косці становішчы прыходзіць з боку ягонага дзядзькі Пятра, які, вызначыўшы сапраўдную прычыну Косцевага цяперашняга расчаравання ("*Ты хацеў стаць героем, а з гэтага нічога не выйшла. Вось таму ты і плачаш, і злуешся*" [3, с. 53]), прапаноўвае захапляльнае выйсце з такога становішча для пляменніка: трэба выкапаць новую – сваю – сажалку.

Здзяйсненне прапанаванага дзядзькам Пятром плана з'яднала не толькі першамайцаў, а і слабадскіх хлопцаў: Яшу Яскаўца і Змітрака Калашкана, якія незадоўга да гэтага пасябравалі, аказаўшыся таксама адзінокімі і не маючымі жадання хадзіць на Тарабанавы зборы. Паступова слабадская "*армія*" мізарнее – яе першамайцы "*разбілі ўшчэнт*". У асяроддзі слабадскіх і першамайскіх хлапчукоў (да першамайцаў далучыліся Яша і Змітрок) мацнеюць старыя захапленні (самакаты, камуна, хатняя бібліятэка) і ўзнікаюць новыя (усталяванне новай копанкі: развядзенне рыбы ў ёй, будоўля "*качэляў*", нарыхтоўка і здача крушыны, каб сабраць грошы на лыжы і канькі, дагляд коней у начным і інш.).

"*Гэтыя першамайцы былі проста цудоўныя хлопцы. Яны не толькі сушылі крушыну, збіралі косці і жалеза. Яны яшчэ хадзілі абкопваць дубкі, лавілі капканамі кратоў і нават памагалі касіць калгаснае жыта*" [3, с. 66].

Прызнаным і аўтарытэтным лідарам аб'яднанай кампаніі хлапчукоў становіцца Косця Кветка, які не толькі здатны да арганізацыі захапляльных спраў для сваіх таварышаў, а і да выхавання ў іх цікавасці да таямнічага і не пазнавальнага да канца свету мастацкіх кніг, якіх Косця "*праглынуў, мабыць болей за сотню*" [3, с. 64]. Косцева "*армія*" ў фінале твора застаецца з ім, нават папаўняецца новымі ваярамі. "*Яша заўважыў, што першамайскія хлопцы зусім не баяцца белагаловага Косці. Яны перабіваюць і нават з ім спрачаюцца. Гэта здзівіла і ўразіла Яшу*". Косця "*нічога не шкадаваў і адразу ішоў на ўступкі <...> ён нейкі ціхі <...> і крычаць не ўмее. Ціхі, памяркоўны Косця здаваўся слабым у параўнанні з самаўпэўненым, грубым Алёшам*". У той жа час ён "*са-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*мастойны і незалежны. <...> Ён не быў такі дужы, як руды Алёша, затое <...> быў вельмі разумны*" [3, с. 61, 63, 64, 68].

"*Камандзірам жа без арміі*" (так думаў пра сябе раней белагаловы Косця Кветка) застаецца адзінокі са сваёй ваяўнічасцю і варожасцю руды Алёша Тарабан. Пра хворага (атруціўся салодкім коржыкам, падрыхтаваным для мышэй у бацькавай краме) былога "*галоўнага камандуючага*" слабадскім "войскам" ранейшыя яго падначаленыя не хочуць і ўспамінаць, не кажучы пра тое, каб шанаваць.

"*Да Алёшы, які не ўставаў з пасцелі цэлых два тыдні, ніхто з хлопцаў не хадзіў. Нават Алесь Бахілка і Аркадзь Панядзелак, якія лічыліся камандзірамі палкоў, абміналі Тарабанаў двор. Яша не вытрымаў і падкалоў аднойчы Бахілку, які, налаташыўшы яблыкаў, еў іх на поўны рот.*

*– Ты хоць бы адно Алёшу занёс. Даведаецца ён, што адзін еў, то пералічыць табе рэбры... Бахілка пачырванеў і ў першую хвіліну нічога не змог адказаць.*

*– Я сам па сабе , а Тарабан сам па сабе. – прамовіў ён нарэшце. – Хіба я наймаўся яму служыць? <...>*

*Алёшава армія распадалася на вачах <...> пра яго ніхто не ўспамінаў. Усім было добра і без Алёшы*" [3, с. 60, 61, 69]. Аднак Тарабан праяўляе такую рысу характару, якую можна характарызаваць як паказальную, – настойлівасць у помсце дзеля захавання сваёй былой улады над ранейшымі "падначаленымі".

"*– Я з вамі пагавару яшчэ, – паабяцаў Алёша* [падпільнаванаму ля Цітавай копанкі Яшу. – А.М.]. *– Не ўцячэ ад мяне ні твой Калашкан, ні Бахілка. Можаш ім перадаць...*

*І Тарабан, даўшы моцнага кухталя, адпусціў Яшу.*

*– Калі яшчэ пойдзеш на Першамайку, то будзе не гэтак, – прыгразіў ён. – Зарубі сабе на носе...*" [3, с. 69]. Не супакойваецца Тарабан і пасля таго, як Яша, Бахілка і Калашкан даказалі яму гуртам, што не дазволяць камандаваць імі.

"*– Па аднаму цяпер не хадзіце, – крычаў ён, – Галовы паадкручваю...*" [3, с. 70].

Такія Алёшавы намеры ў праекцыі іх і на яго паводзіны, і ўвогуле на падобныя паводзіны дзяцей і дарослых можна назваць тарабанаўшчынай – адной з паказальных і пашыраных сацыяльных з'яў.

Яша адзіны, хто памкнуўся праявіць міласэрнасць у адносінах да Алёшы. Назіраючы відавочнае падзенне былога "аўтарытэта"-дыктатара на вачах амаль ва ўсёй слабадской кампаніі, яго адзіноту на ўласным двары, хлопчык спачувае Тарабану. "*Яшу зрабілася нават шкада Алёшы. Усё-такі ён смелы хлопец. Ён жа і не дурны. Ці нельга з ім дамовіцца проста, без ніякай бойкі?*" [3, с. 70]. У дадзеным выпадку былая ахвяра аказваецца ў маральных адносінах вышэй за свайго прыгнятальніка. Аднак цяперашні "*генерал без арміі*" дэманструе сваю агрэсіўнасць і разбуральныя настроі яго свядомасці, спадзеючыся на перамогу ўласнай сілы і вяртанне былой улады. Тарабанаўшчына зноў вылазіць на паверхню.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аповесць заканчваецца аптымістычна: Яша, Змітрок і Косця выпускаюць з клеткі на волю Яшавага голуба. Ёсць у гэтым учынку падлеткаў нешта сімвалічнае. Такім сваім учынкам яны засведчылі неабходнасць волі для любога жывога стварэння, у тым ліку і для сябе, сваіх таварышаў, якія прайшлі праз выпрабаванні прымусу, здолеўшы ўвайсці ў вольную прастору гарманічных узаемаадносін.

Тарабан "*болей не займаў у <…> думках* [хлапчукоў. – А.М.] *ніякага месца*". Ён, хоць і "*смелы Алёша Тарабан*", але "*не ведаў ні пра ледавікі, ні пра Хрыстафора Калумба, ні нават пра тое, што ў хуткім часе людзі паляцяць да самых зор...*" [3, с. 70].

Сацыяльнае супрацьстаянне, магчымае для дарослага асяроддзя, пераносіцца ў аповесці І. Навуменкі "Вайна каля Цітавай копанкі" на сферу дзіцячых узаемаадносін. Нягледзячы на рэцэпцыйную адраснасць твора (дзіцячая аўдыторыя), ён не толькі адлюстроўвае заганныя сацыяльныя з'явы, а і ўтрымлівае ў сабе элементы выкрыцця гэтых з'яў: дыктату і падпарадкавання яму, здрады, душэўнай чэрствасці, абыякавасці, помсты і інш. У той жа час у аповесці не толькі адлюстраваны працэс перамогі антыподаў названых вышэй з'яў (выхаваўчы аспект дзіцячага твора), а і прасочваюцца вытокі такіх заганных з'яў. Аповесць "Вайна каля Цітавай копанкі" мае такі эстэтычны і пазнавальны змест, які здольны актуалізавацца ў новай (значна аддаленай ад часу напісання твора) рэцэпцыйнай прасторы.

## Спіс літаратуры

1. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V–XI класы / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – 127 с.
2. **Кароткая, Л.** Ад імя пакалення / Л.Кароткая // Навуменка, І. Збор твораў : у 6 т. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 2. – С. 5–24.
3. **Навуменка, І.** Збор твораў : у 6 т. Т. 2 : Аповесці і апавяданні. -- Мінск : Маст. літ., 1982. – С. 7–71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова